ЛИТЕРАТУРА

1. Беспалько, В. П. Основы теории педагогических систем: Проблемы и методы психолого-педагогического обеспечения технических обучающих систем / В. П. Беспалько. Воронеж. Изд-во Воронеж. ун-та, 1997. - 304 с.
2. Курок, В. П. Організація аудиторної дослідницької роботи майбутніх інженерів-педагогів у процесі фахової підготовки / В. П. Курок, В.П. Опанасенко // Науковий часопис Національного педагогічного університету ім. М. П. Драгоманова. Серія 5. Педагогічні науки: реалії та перспективи. Вип. 51 : збірник наукових праць. Київ. Вид-во НПУ ім. М. П. Драгоманова. - 2015. - С. 157–163.
3. Ігнатенко, Г.В. Знаково-символічна наочність: сутність та класифікація / Г.В. Ігнатенко, Є.І. Єрмоленко // Вісник Глухівського національного педагогічного університету імені Олександра Довженка. Серія: Педагогічні науки. Глухів. - 2017. - С.11-119.

УДК 811.161.3 (476)

## РОЛЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ Ў ФАРМІРАВАННІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ САМАПАВАГІ

**А.М. Асіпчук**
УА “Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт” (Рэспубліка Беларусь, 230008, г. Гродна, вул. Церашковай, 28; e-mail: ggau@ggau.by)

Анатацыя. У артыкуле разглядаецца значэнне беларускай мовы ў фарміраванні і захаванні нацыянальнай самапавагі, а таксама звяртаецца ўвага на ролю выкладчыка ў павышэнні прэстыжу роднага слова.
Ключавыя словы: беларуская мова, білінгвізм, нацыянальна-моўная палітыка, этнічная ідэнтыфікацыя.

## РОЛЬ БЕЛОРУССКОГО ЯЗЫКА В ФОРМИРОВАНИИ НАЦИОНАЛЬНОГО САМОУВАЖЕНИЯ

**О.Н. Осипчук**
УО “Гродненский государственный аграрный университет” (Республика Беларусь, 230008, г. Гродно, ул. Терешковой, 28; e-mail: ggau@ggau.by)

Аннотация. В статье рассматривается значение белорусского языка в формировании и сохранении национального самоуважения, а также акцентируется внимание на роли преподавателя в повышении престижа родного языка.
Ключевые слова: белорусский язык, билингвизм, национально-языковая политика, этническая идентификация.

## THE BELARUSIAN LANGUAGE ROLE IN THE FORMING OF NATIONAL SELF-ESTEEM

**A.M. Asipchuk**
EI “Grodno State Agrarian University” (Belarus, Grodno, 230008, 28 Tereshkova st.; e-mail: ggau@ggau.by)

Summary. The Belarusian language importance in the forming and conservation of national self-esteem is considered in the article, a lecturer’s role in the enhancing the prestige of the vernacular is at the center of attention.
Key words: the Belarusian language, bilingualism, national language policy, ethnic identification.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

У час сусветнай інтэграцыі і глабалізацыі архіважным для многіх народаў з'яўляецца пытанне захавання нацыянальнай самабытнасці, этнічнай адметнасці. Беларусы не выключэнне. Пры характарыстыцы такога паняцця, як "нацыя", абавязковым кампанентам называецца мова. Менавіта мова – духоўны падмурак і, кажучы вобразна, душа народа, без якой ён не можа існаваць. Добра вядомыя словы класіка, пачынальніка новай беларускай літаратуры Францішка Багушэвіча таму сведчанне: "Шмат было такіх народаў, што страцілі найперш сваю мову, так як той чалавек перад сканаеннем, катораму мову займае, пасля зусім замерлі.. Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!". А наш сучаснік Алесь Разанаў, паэт, перакладчык, сцвярджае: "Кожны народ мае хаця б адзін геніяльны твор, і гэты твор – мова". І беларусы могуць ганарыцца гэтым "геніяльным творам", паколькі наша мова лічыцца адной з самых мілагучных моў свету, мае багатую лексіку і фразеалогію, распрацаваную па ўсіх галінах навуковую тэрміналогію. На старабеларускай мове, якая з'яўлялася дзяржаўнай у ВКЛ, была створана разнастайная ў жанравым плане літаратура (справавая, юрыдычная, вучэбная, публіцыстычная, арыгінальныя і перакладныя мастацкія творы і інш.).Больш за тое, старабеларуская мова выконвала функцыю дыпламатычных зносін, аказвала ўплыў на суседнія мовы, у прыватнасці, на літаратурную мову рускай народнасці. Аднак у сілу пэўных гістарычных прычын (землі нашых продкаў увайшлі ў склад Рэчы Паспалітай, а затым – у склад Расійскай імперыі)апынулася пад забаронай больш як на двастагоддзі і пачала адраджацца толькі ў канцы XIX – пачатку XX ст., "вырастаючы" з народных гаворак. Працэс беларусізацыі ў 20-я гады XX ст. аказаўся плённым, але непрацяглым і быў гвалтоўна спынены сталінскімі рэпрэсіямі. У другой палове XX ст. нацыянальна-моўная палітыка дзяржавы насіла русіфікатарскі характар, што негатыўна паўплывала на функцыянаванне беларускай мовы. Апошняя хваля беларусізацыі, звязаная з распадам СССР і ўтварэннем суверэннай Беларусі, дзе адзінай дзяржаўнай мовай стала мова тытульнай нацыі, абарвалася агульнарэспубліканскім рэферэндумам 14 мая 1995 года. Рэферэндум паказаў, на якім узроўні культурнага развіцця знаходзіца наша грамадства.

Што да роднай мовы ў сучаснай Беларусі, то, як справядліва і слушна заўважае прафесар І.Я. Лепешаў, "сітуацыя з беларускай мовай у краіне катастрафічная. Тут няма патрэбы прыводзіць вядомыя, неаспрэчныя факты пра адсутнасць беларускіх школ у нашых гарадах, сярэдніх і вышэйшых устаноў адукацыі з беларускай мовай навучання, пра іншамоўную дзейнасць нашага радыё і тэлебачання, пра газеты, у якіх толькі назва надрукавана па-беларуску (скажам, "Рэспубліка", "Гродзенская праўда") і г. д. Усяго гэтага не можа бачыць толькі сляпы" [2, с. 5]. І сапраўды, ва ўмовах дзяржаўнага білінгвізму родная мова сёння не з'яўляецца сродкам зносін нацыі, не выкарыстоўваецца ў поўным аб'ёме ў такіх сферах, як справаводства, адукацыя, навука, СМІ і інш. Нездарма ЮНЕСКА ўключыла беларускую мову ў спіс моў, якім пагражае поўны заняпад і знікненне. Некаторыя даследчыкі прагназуюць менавіта такі, ірландскі, шлях развіцця беларускай мовы (юрыдычна абедзве мовы маюць раўнапраўны статус, а фактычна адбываецца скарачэнне функцый роднай мовы аж да змярцвення). Безумоўна, ёсць пэўныя



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

спробы з боку творчай інтэлігенцыі, асобных грамадскіх арганізацый (напрыклад, Таварыства беларускай мовы імя Францыска Скарыны) папулярызаваць роднае слова,аднак гэтага недастаткова.

Выключную ролю ў фарміраванні нацыянальнайгоднасці з дзяцінства павінны адыгрываць сям'я і ўстановы адукацыі. Важна карэнным чынам змяніць стаўленне да сваёй мовы, успрымацьяе не толькі як каштоўнасць духоўнага парадку, але і як сапраўдную абарону нацыі. Актуальным для беларусаў гучыць выказванне ірландскага вучонага Дэві: “Кожны народ павінен зберагаць сваю мову больш, чым межы, бо мова – галоўная яго абарона, куды больш моцная, чым усе цытадэлі”.

Дысцыпліна “Беларуская мова (прафесійная лексіка)”, якая выкладаецца ва ўсіх ВНУ і каледжах нашай краіны, прадугледжвае вырашэнне шматлікіх дыдактычных і выхаваўчых задач, у тым ліку яна павінна “спрыяць павышэнню грамадскага прэстыжу беларускай літаратурнай мовы як мовы тытульнай нацыі ў Рэспубліцы Беларусь”, а таксама “…выхоўваць пачуццё нацыянальнай самапавагі і самаідэнтыфікацыі…” [1, с. 6–7]. Паспяховасць рэалізацыі такіх задач у многім залежыць ад асобасных якасцей выкладчыка, яго ўменя зацікавіць студэнтаў (наколькі гэта магчыма ў суцэльна рускамоўным асяроддзі) карыстацца родным словам не толькі на занятках па беларускай мове, але і па-за аўдыторыяй. Як паказвае практыка, у пераважнай большасці першакурснікаў (і моладзі ўвогуле), на жаль, вельмі нізкая матывацыя ва ўжыванні беларускай мовы, абсалютна атрафіравана пачуццё нацыянальнай самапавагі. Усё гэта – наступствы шматвекавой асіміляцыі і, напэўна, гістарычна сфарміраванай ментальнасці беларусаў. Ад выкладчыка вышэйназванага курса патрабуецца не толькі глыбокае валоданне навуковым матэрыялам, але і асабісты прыклад высокай маўленчай культуры і бездакорнага валодання родным словам. Па вызначэнні М.Г. Яленскага, “моўная асоба выкладчыка ў маргінальным, з аморфнай моўнай сітуацыяй грамадстве становіцца своеасаблівым антыкаразійным сродкам, які здольны ўплываць на фарміраванне не толькі нацыянальнай самасвядомасці ў цэлым, але і моўнай культуры ў прыватнасці” [3, с. 57].

Такім чынам, пачуццё нацыянальнай самапавагі непасрэдна звязана з годным стаўленнем да беларускай мовы, да яе захавання, узбагачэння і, галоўнае, актыўнага выкарыстання.

ЛІТАРАТУРА

1. Беларуская мова (прафесійная лексіка): тыпавая вучэб. праграма для выш. навуч. устаноў / склад.: М.Р. Прыгодзіч, Г.І. Кулеш, Н.П. Лобань; пад рэд. М.Р. Прыгодзіча. – Мінск: РІВШ, 2008. – 28 с.
2. Лепешаў, І.Я. Перад змяркannем: зб. артыкулаў / Іван Лепешаў. – Гродна: “ЮрСаПрынт”, 2013. – 232 с.
3. Яленскі, М.Г. Вучань і настаўнік як моўныя асобы / М.Г. Яленскі // Роднае слова. – 2000. – № 8. – С. 55–58.